# *МАШКЕВІЧ ВАНДА КАНСТАНЦІНАЎНА*

в. Бабічы, Шчучынскі раён. Ткацтва.



Ванда Канстанцінаўна Машкевіч нарадзілася 23 жніўня 1934 года ў сялянскай сям'і ў в. Быкаўка Шчучынскага раёна. Увесь час працавала на розных работах у мясцовым калгасе. Сёння жыве ў в.Бабічы Шчучынскага раёна. Самастойна займацца ткацтвам пачала з 15 гадоў. За два дні руплівай працы дзяўчынка Ванда магла выткаць посцілку. Майстэрства пераняла ад матулі Станіславы Іванаўны Вялічка (1912-2012 гг.). Урыўкамі садзілася за кросны, а каб далікатна аздобіць рушнікі і прасціны ад мясцовых майстрых навучылася шыдэлкам вязаць карункі ў традыцыйным стылі. На сённяшні дзень В.М. Машкевіч мае калекцыю тканага кужалю, абрусоў, дываноў, вязаных падзорнікаў, выробленых шыдэлкам у народных традыцыях. Вырабляе са штучнай стужкі зграбныя кошычкі для агародніны, якую сама і вырошчвае. Руплівая майстрыха нават спляла 16 метраў сеткі са шпагату для агароджвання падворка. Таксама яна з'яўляецца ўдзельніцай народнага фальклорнага гурта "Вяргіня" аддзела культуры і дасуга "Ракавіцкі Дом культуры" дзяржаўнай установы культуры "Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці". Жанчына з задавальненнем прымае ўдзел у святах, фестывалях, выстаўках народнай творчасці. Яна дапамагае аддзелу рамесніцкай дзейнасці і народнага мастацтва дзяржаўнай установы культуры "Шчучынскі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці" адраджаць мясцовыя тэхнікі ткацтва, праводзячы майстар-класы для дзяцей і падлеткаў. У лістападзе 2017 года ў выставачнай зале дзяржаўнай установы культуры "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай



творчасці" Ванда Канстанцінаўна прыняла ўдзел у абласной выставе народнага мастацтва "З глыбінь народных да нашых дзён". За шматгадовую працу па захаванні і папулярызацыі традыцыйных рамёстваў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь у студзені 2018 года прысвоіла В.К. Машкевіч званне "Народны майстар".



